Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

# СПЕЦПРАКТЫКУМ

Вучэбная праграма па выяўленчаму мастацтву (малюнак і жывапіс)
для студэнтаў спецыялізацыі 18 01 01 "

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Шаура Р.Ф. - доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў .

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Л. Я. Дзягілеў, загадчык кафедры дызайна прыватнай У А «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 11 ад 28.06.2012);

Навукова метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № ад )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Тлумачальная запіска

У праграмме падрыхтоўкі спецыялістаў па выяўленчым мастацтве малюнак, жывапіс з’яўляюцца адной з вядучых дысцыплін.

Асновай метаду навучання малюнку і жывапісу з’яўляецца  маляванне з натуры. Для больш кантраснага выяўлення формы сродкамі светлаценю большасць заданняў па малюнку рэкамендуецца выконваць пры штучным асвятленні. У залежнасці ад складанасці ці напраўленасці задання адводзіцца і адпаведная колькасць гадзін.

У працэсе праходжання студэнтамі вучэбнага курса “малюнак” і “жывапіс” выкарыстоўваюцца розныя тэхналогіі і метады навучання. Адной з тэхналогій, якая дазваляе навучэнцу стаць суб”ектам навучання і паспяхова развіваць самастойнасць і камунікатыўныя ўменні з”яўляецца *тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання,* або калектыўны спосаб набыцця ўменняў і навыкаў у выўленчым мастацтве.

Калектыўным спосабам навучання з”яўляецца такая яго арганізацыя, пры якой навучанне студэнтаў ажыццяўляецца шляхам іх сумеснай працы над малюнкам, дзе бачны творчы ўзровень і веды кожнага, пры тым работы найбольш паспяховых студэнтаў могуць служыць пэўным узорам для меньш падрыхтаваных у выяўленчым мастацтве.

Пры выкарыстанні ў навучальным працэсе тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання, асобныя заданні, прадугледжаныя праграмай, навучэнцамі выконваюцца самастойна, без удзелу выкладчыка і на пераходных этапах навучальнага працэсу работы абмяркоўваюцца і аналізуюцца ў прысутнасці кіраўніка і навучэнцаў.

*Тэхналогія поўнага засваення ведаў і навыкаў* прадугледжвае арганізацыю працэса аптымізацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў пры выкарыстанні сукупнасці спосабаў (метадаў, прыёмаў, аперацый)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічнага ўзаемадзеяння (уздзеяння), якія робяць дасягненне больш высокага выніку ўсімі навучэнцамі ў навучальным працэсе.

*Тэхналогія арганізацыі рэфлексійнай дзейнасці* – гэта здольнасць чалавека да самапазнання, якое з”яўляецца праяўленнем унутрыасобаснага інтэлекта. Для ўсіх тыпаў рэфлексіі найбольш агульнымі спосабамі з”яўляюцца:

- выражэнне ўпэўненасці;
- меркаванні;
- сумненні;
- пытанні.

Усе віды рэфлексіі актывізуюцца пры стварэнні ў чалавека ўстаноўкі назіраць і аналізаваць уласнае пазнанне, паводзіны і разуменне гэтых паводзінаў пры вырашэнні вучэбных і творчых задач.

Вучэбная праграма па спецпрактыкуму распрацавана ў адпаведнасці з існуючымі адукацыйнымі стандартамі і грунтуецца на прынцыпах навуковасці, свядомасці, даступнасці і пасільнасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці вырашэння тэхніка-выканальніцкіх задач, і прадугледжвае выкарыстанне ў навучальным працэсе такіх метадаў навукова-творчага пазнання, як *назіранне, параўнанне, абагульненне*, метад *аналізу і сінтэзу*.

Матэрыял вучэбнай праграмы мае непасрэдную сувязь з іншымі прадметамі не толькі мастацкага профілю, такімі, як “кампазіцыя”, “перспектыва”, “пластанатомія”, але і з педагогікай, псіхалогіяй, культуралогіяй.

Уся праграма разлічана на правядзенне заняткаў па малюнку і жывапісу. У кожным семестры заданні прапануюцца ў такім парадку, каб студэнты змаглі больш поўна авалодаць усімі метадамі малюнка і жывапісу, неабходнымі спецыялісту ў галіне выяўленчага мастацтва, а таксама педагагічнай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўным прынцыпам работы над малюнкам і жывпісам з'яўляецца паслядоўнае яго выкананне: ад агульнага да прыватнага і ад прыватнага да ўзбагачанага дэталямі агульнага, ад простага да складанага.

Праграма прадугледжвае выкананне наступных вучэбных *задач:*

- развіццё культуры ўспрыняцця, вобразнага мыслення і прасторавага прадстаўлення студэнтаў;
- набыццё неабходных тэарэтычных ведаў па малюнку і іх выкарыстанне ў мастацкай практыцы;
- выпрацоўка прафесійнага майстэрства графічных прыёмаў малявання;
- авалоданне тэхнікай малюнка з выкарыстаннем розных матэрыялаў (аловак, вугаль, сангіна, соус);
- фарміраванне асацыятыўна-вобразнага мыслення мастака ў стварэнні графічных і дэкаратыўных кампазіцый;
- засваенне методыкі стварэння графічнай выявы на аснове існуючых законаў і правілаў мастацкага вырашэння твора;
- развіццё здольнасцей і творчай актыўнасці студэнтаў ў працэсе мастацка-практычнай дзейнасці.

Выпускнік павінен

***ведаць:***

- акадэмічныя правілы і законы малюнку і кампазіцыі;
- законы прасторавай пабудовы малюнку;
- прыёмы кампазіцыйнага вырашэння малюнку;
- прыёмы танальнай і сятлоценявой распрацокі малюнку;

***умець:***

- арганізоўваць забеспячэнне тэхнічнымі сродкамі цэльнасці работы;
- дакладна будаваць кампазіцыю малюнка;
- выкарыстоўваць роныя мастацкія тэхнікі;
- выкарыстоўваць розныя прыёмы танальнай і святлоценявой распрацоўкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- *Змест* праграмы вызначае канкрэтныя тэмы заданняў, аб’ём неабходнага часу на вучэбныя пастаноўкі і канкрэтызуе асноўныя задачы, якія павінен выканаць студэнт.
- У першым семестры аб’ектам малявання з натуры з’яўляецца нацюрморт, далей практычныя заданні запланаваны на засваенне практыкі малюнка галавы чалавека. Прапануецца выкананне малюнка чэрапа чалавека, экарше, гіпсавых адбіткаў (вуха, нос, вока, рот).
- Паралельна з практычнымі заняткамі, праграмай прадугледжаны самастойныя заданні, якія больш поўна дазволяць студэнтам авалодаць ведамі і навыкамі малявання – гэта анатамічныя табліцы галавы і фігуры чалавека, а таксама копіі малюнкаў, зробленыя мастакамі – класікамі. Гэта дазволіць больш поўна авалодаць навыкамі выканання прадугледжаных праграмай заданняў і падрыхтаваць спецыялістаў у галіне мастацтва больш высокай якасці.
- На працягу кожнага семестра паралельна з выкананнем практычных і самастойных заданняў студэнтам прапануецца рабіць хатнія замалёўкі, накіды, кампазіцыйныя распрацоўкі, што ў значнай ступені садзейнічае ім развіццю зрокавай памяці і назіральнасці. Выконваць іх прапануецца рознымі матэрыяламі (аловак, пэндзель, пяро і г.д.)
- У трэцім-шостым семестрах асноўнымі заданнямі з’яўляюцца малюнкі гіпсавай галавы, галавы натуршчыка, рук, ног і торса чалавека.
- Заданні сёмага і восьмага семестра цалкам прысвечаны маляванню агаленай фігуры чалавека, мужчынскай і жаночай. Адпаведна адведзенай колькасці гадзін пастаноўкі для малюнкаў фігуры чалавека прапануюцца не ў складаных позах, без залішніх ракурсаў, але з такім улікам, каб навучанне маляванню поўнасцю адпавядала якаснай падрыхтоўцы спецыяліста народнага дэкаратыўна-прыкладнога напрамку і рэстаўрацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва
- Асаблівасцю заданняў па маляванню фігуры чалавека з’яўляецца тое, што выконваць іх прапануецца з некаторымі абмежаваннямі, без

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танальнай апрацоўкі фона. Танальныя суадносіны фігуры натуршчыка адносна фона прапануецца рабіць праз контурную лінію, кантрастнасць і характар якой мяняецца ў залежнасці ад асвятлення той ці іншай часткі фігуры. Такі метад выканання малюнка стрымлівае студэнта ад залішняй штрыхоўкі, дысцыплінуе ад злоўжывання тонам, канцэнтруе ўвагу над выкананнем галоўных задач малюнка.

- Для таго, каб паспяхова весці педагагічную і творчую працу, спецыялісту ў галіне народных рамёстваў належыць вывучаць і тэарэтычныя асновы малюнка. З гэтай мэтай ва ўсіх семестрах у праграму уключаны лекцыі па тэорыі малюнка. Будучы выкладчык, кіраўнік творчага калектыву павінен не толькі ўмець паказаць пабудовы формы ў малюнку але і добра ведаць мастацтвазнаўчую тэрміналогію, умець тлумачыць заканамернасці пабудовы натуры, паслядоўнасці работы над малюнкам.
- Уся вучэбная праца па малюнку непарыўна звязана з практычным вывучэннем перспектывы, пластычнай анатоміі. Набытыя такім чынам веды і навыкі шляхам практычнай работы па малюнку даюць магчымасць прафесійна выконваць мастацкія творы ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, высокапрафесійна працаваць на ніве выкладчыцкай дзейнасці ў галіне выяўленчага мастацтва.
- Паспяховасць студэнтаў кантралюецца шляхам прагляду іх работ (аўдыторных пастановак і самастойных заданняў), выкананых за пэўны перыяд часу у семестрах. Прагляд студэнцкіх работ і выстаўленне адзнак ажыццяўляе камісія, у склад якой уваходзіць выкладчыкі кафедры. Выкладчык падрабязна аналізуе работы студэнтаў і ўсе пытанні, якія ўзнікаюць за час прагляду.
- Для замацавання ведаў, набытых у час аўдыторных заняткаў на працягу года, студэнты выязджаюць на пленэр і па спецыяльнай праграме выконваюць заданні па малюнку, жывапісе і кампазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Вучэбным планам і праграмай прадугледжваецца ў канцы кожнага семестра правядзенне залікаў і іспытаў.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | лабараторныя |
| **МАЛЮНАК** | | |
| 1.Малюнак, яго сутнасць і значэнне ў выяўленчым мастацтве. Законы, правілы і тэхнічныя прыёмы ў малюнку. | | 8 |
| 2.Малюнак у працэсе пазнання і аналізу натуры. Сродкі выяўлення формы. Законы лінейнай і паветранай перспектывы | | 24 |
| 3.Асаблівасці партрэтнай выявы галавы чалавека | | 24 |
| 4.Партрэтная характарыстыка мадэлі ў малюнку. | | 14 |
| **Усяго** | | **70** |
| **ЖЫВАПІС** | | |
| 1.Асновы тэхналогіі станковага жывапісу. Танальнасць і каларыт – асноўныя выразныя сродкі жывапісу. | | 8 |
| 2. Спосабы і прыёмы акадэмічнага жывапісу ў адлюстраванні якасных характарыстык рэчаўнага свету. | | 20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| 3. Асаблівасці жывапісна-пластычнага ўвасаблення рэчаўна-прасторавага асяроддзя ў інтэр”еры. | | 30 |
| 4. Метад работы танальна-колеравымі адносінамі ў адлюстраванні прадметнай рэчаіснасці і жывой натуры. | | 12 |
| **Усяго** | | **70** |
| **Разам** | **140** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ (*МАЛЮНАК*)

### Тэма 1. Малюнак, яго сутнасць і значэнне ў выяўленчым мастацтве. Законы, правілы і тэхнічныя прыёмы ў малюнку.

Паняцце “малюнак”. Разнавіднасці малюнка. Тэхніка, метады і характар малявання. Вучэбны і творчы малюнак. Маляванне па ўспрыманні і па ўяўленні. Лінейная і паветраная перспектыва, святло і цені, лінія і тон ў малюнку. Малюнкі доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя, лінейныя і святлоценявыя. Тэхнікі выканання малюнка, матэрялы і інструменты, якія выкарыстоўваюцца пры маляванні. З гісторыі развіцця малюнка. Малюнак у мастацтве Старажытнага свету, сярэднявечча, эпохі Адраджэння, перыяду XVII стагоддзя. Малюнак у сучасным выяўленчым мастацтве.

На першым этапе прапанаванага курса студэнту даецца магчымасць засвоіць асноўныя палажэнні акадэмічнага малюнка, навучыцца правільна будаваць прадметы на лісце паперы з улікам лінейнай перспектывы, знаходзіць прапарцыянальныя адносіны паміж дэталяў нацюрморта, перадаваць аб”ём прадметаў за кошт святло-ценявой прапрацоўкі, выдзеляць

глыбіню прастору, аб’’ядноўваць усе прадметы кампазіцыі ў цэласную графічную структуру. Для набыцця першапачатковых графічных ведаў студэнтам прапаноўваецца малюнак нацюрмортаў з розных па фактуры і матэрыялу прадметаў. Пастаноўкі звычайна складаюцца з бытавых і геаметрычных рэчаў з розных матэрыялаў: гіпса, дрэва, керамікі, драпіроўкі, размешчаных па вертыкалі або па гарызанталі. Крытэрыямі ацэнкі падобных заданняў з’’яўляюцца:

- правільнае кампазіцыйнае размяшчэнне пастаноўкі нацюрморта на лісце паперы з улікам яго аптычнай сярэдзіны і гарманічнай раўнавагі ўсіх прадметаў адносна плоскасці ліста;
- захаванне правілаў і прыёмаў лінейнай перспектывы ў малюнку;
- выяўленне прапарцыянальных суадносінаў прадметаў нацюрморта;
- вырашэнне святло-ценявой характарыстыкі прадметаў нацюрморта за кошт штрыхавой графічнай прапрацоўкі;
- перадача глыбіні прастору ў малюнку;
- выяўленне матэрыяльнасці прадметаў

Далейшае засваенне законаў выяўленчага мастацтва ў малюнку ажыццяўляецца за кошт выканання нацюрмортаў з канкрэтнымі характарыстыкамі:

- нацюрморт з гіпсавых геаметрычных прадметаў на нейтральным фоне;
- нацюрморт з геаметрычнымі і бытавымі прадметамі прамавугольнай і сферычна формы на фоне нескладанай драпіроўкі;
- нацюрморт з батавых прадметаў, разных па фактуры: драўляныя, металічныя рэчы, прадметы, зробленыя са шкла і керамікі, размешчаныя на фоне драпіроўкі;
- нацюрморт з бытавых прадметаў, фруктаў, агародніны, размешчаных на шматузроўневых плоскасцях з драпіроўкамі;
- малюнак нацюрморта з табурэтак. Пастаноўка з двух табурэтак, закампанаваных пад рознымі вугламі зроку;
- малюнак складак тканіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з аудыторнай работай для засваення правілаў малюнка і набыцця больш глыбокіх ведаў у графічным мастацтве студэнтам прапануецца выканаць шэраг самастойных заданняў – накідаў, замалёвак бытавых прадметаў прамавугольнай і сферычных формаў на лістах паперы фарматам А-3, а таксама замалёвак інтэр”ераў памяшканняў і эцюдаў гарадскіх пейзажаў (фармат паперы А-4).

## Тэма 2. Малюнак у працэсе пазнання і аналізу натуры. Сродкі выяўлення формы. Законы лінейнай і паветранай перспектывы

Пасля праходжання курса заданняў па маляванні нацюрмортаў студэнты прыступаюць да засваення правілаў малявавання выявы чалавека. Гэты працэс найбольш складаны ў малюнку і таму ён разлічаны на больш доўгі і працяглы перыяд выканання заданняў, разлічаны на паступовае вывучэнне анатамічных асаблівасцей пабудовы шкілета чалавека, яго асобных частак: чэрапа чалавека, дэталей галаваы (нос, вочы, вуха, вусны, рукі, ногі, торс, фігура).

Студэнтам прапаноўваецца малюнак чэрапа чалавека ў двух паваротах (профіль і фас на адным лісце паперы). Пабудаваць выяву чэрапа чалавека з улікам яго анатамічных асаблівасцей, праявіць уменне графічна адлюстраваць не толькі як пастановачны прадмет, які знаходзіцца ў пэўнай прасторы, але і выявіць асноўныя яго характарыстыкі, пластычныя якасці чэрапна-мазгавой часткі і часткі твару. Важный акцэнт у дадзеным заданні ставіцца на дэтальнае вывучэнне пабудовы чэрапа чалавека, яго галоўных складаючых: лобных пагоркаў, надброўных дуг, вачніц і насавых касцей, скулавых і вісочных касцей, верхняй і ніжняй чэлюсці і інш., і перадачу графічнымі сродкамі пастановачнага прадмета як цэласнай канструкцыі. Далей студэнты працуюць над дэталямі гіпсавай галавы Давіда – адбіткаў са скульптуры Мікельанджэла (нос, вуха, вока, губы). Асноўная задача у дадзеным заданні - сфарміраваць у студэнтаў навыкі і уменні правільна з пункту гледжання лінейнай перспектывы перадаць графічнымі сродкамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форму асобных дэталяў галавы, у прыватнасці, пластыку носа, вачэй, вуха, губ, выявіць канструтыўнае рашэнне кожнай дэталі, замацаваць веды па іх пабудове, пошука прапарцыянальных суадносін ў маштабе агульнай структуры галавы чалавека. У працэсе выканання кожнага задання таксама ставіцца задача адпрацоўкі графічнай культуры малюнка, павышэння майстэрства валодання лініяй як галоўнага сродка выяўленчай граматы.

Выкананне малюнка экаршэ і гіпсавай абрубовачнай галавы на агульным лісце паперы прадугледжвае мэту вывучэння ў працэсе малявання анатамічнай пабудовы асноўных мышц галавы чалавека і затым праз абагуленыя геаметрычныя формы умоўнай канструкцыі перайсці да малявання гіпсавых адбіткаў галавы з ўзораў грэчаскіх антычных міфалагічных герояў.

Праграмнае заданне па пабудове гіпсавага экаршэ і абрубовачнай галавы арыентавана на максімальна дасканалае засваенне правілаў і прыёмаў малявання галавы чалавека у час вывучэння яе анатамічнай канструкцыі шляхам замалёвак асноўнай групы мышц, якія фарміруюць твар чалавека, яго канкрэтны вобраз. Набыць навыкі і уменні малявання галавы чалавека праз абагульненне анатамічных форм, бачыць асноўную канструктыўную мадэль у цэласным характары яе прадстаўлення. Наступны этап работы над малюнкам галавы чалавека прадстаўляе магчымасць канкрэтызаваць і дэталізаваць яе форму, выявіць знешні характар і індывідуальныя асаблівасці таго ці іншага персанажа.

У мэтах пашырэння дыяпазону выяўленчых сродкаў малюнка студэнтам прапануецца самастойна выканаць заданні наступнага складу:

- накіды галавы чалавека (натуршчыка) ў статычнай позе. Лінейна-штрыхавое выкананне: аловак, фармат паперы – Ф-5, колкасць – 10 накідаў;
- накіды галавы чалавека (натуршчыка) ў дынамічнай позе. Лінейна-штрыхавое выкананне: аловак, фармат паперы – Ф-5, колкасць – 10 накідаў

## Тэма 3. Асаблівасці партрэтнай выявы галавы чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Малюнак адбітка гіпсавай галавы. Канструктыўная пабудова складанай формы галавы. Кампаноўка на лісце паперы малюнка гіпсавай галавы па правілах аптычнай сярэдзіны, выкарыстоўваючы законы перспектывы і веды ў галіне пластычнай анатоміі. Вызначэнне асноўных характарыстык пастаноўкі: паварот галавы, вачэй, форма носа, губ, арыентуючыся на першым этапе на абагуленыя формы выяўленчай перадачы. Захаванне прапарцыянальных суадносінаў шырыні да вышыні агульнай пастаноўкі, а таксама прапрцый галоўных дэталяў галавы. Вызначэнне напрамка святла і лінейна-танавое вырашэнне. Арыентацыя пры маляванні на характэрныя анатамічныя апорныя і вузлавыя кропкі, вызначаючы накірунак, рух, прапорцыі і масу формы галавы і падпарадкоўваючы іх законам перспектывы. Выявіць пластыку анатамічнай пабудовы мадэлі ў танавым графічныі адлюстраванні. Выкарыстанне методыкі паслядоўнай пабудовы малюнка – ад агульнага да прыватнага і ад дэталізацыі да абагульнення. Схема дзялення галавы па вертыкалі і гарызанталі. Анатамічная канструкцыя і перспектыўная пабудова. Пошук характара мадэлі і адлюстраванне яго ў малюнку. Выяўленне графічнага баланса паміж пярэднім і дальнім планамі, выкарыстоўваючы святлоценявой мадэліроўкі.

Перадача асноўных прапорцый галавы натуршчыка. Асноўныя анатамічныя характарыстыкі. Перспектыўныя змяненні натуры ў залежнасці ад месца знаходжання малюючага. Выяўленне галоўных рыс натуры. Анатамічная канструкцыя малюнка, вызначэнне характэрных асаблівасцей галавы натуршчыка, твару, агульная схема пабудовы і яе выкарыстанне ў працы. Дэтальная прапрацоўка і абагульненні. Графічныя прыёмы аб”ёмнай святлоценявой перадачы выявы на двухмернай прасторы паперы.

Вызначэнне напрамка святла і лінейна-танавое вырашэнне. Пошук характара мадэлі і адлюстраванне яго ў малюнку.

Асноўныя парпорцыі і анатамічная характарыстыка гіпсавых адбіткаў рукі і нагі метадам канструкцыйна-анатамічнага аналізу формы. Выяўленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пластыкі анатамічнай пабудовы рукі і нагі ў танавым графічным адлюстраванні.

Засваенне законаў работы лінейна-танальнымі адносінамі ў адлюстраванні гіпсавых адбіткаў галавы чалавека, рук і ног, а таксама натуршчыка ажыццяўляецца ў працэсе выканання наступных заданняў з паслядоўным ускладненнем задач:

- малюнак галавы Гатамелаты;
- малюнак гіпсавай маскі Давіда;
- малюнак гіпсавых адбіткаў рук і нагі;
- малюнак мужчынскай галавы натуршчыка;
- малюнак жаночай галавы натуршчыка.

Разам з аудыторнымі работамі для замацавання пройдзенага матэрыялу студэнтам прапануецца выканаць некалькі самастойных заданняў:

- малюнах гіпсавай галавы Вальтэра, папера А-2;
- замалёўкі галавы натуршчыка (працяглы малюнак), аўтапартрэт, папера А-3.

## Тэма 4. Партрэтная характарыстыка мадэлі ў малюнку

Асаблівасці пабудовы малюнка галавы чалавека з плечавым поясям і рукамі. Выяўленне характэрных прапорцый асобных дэталяў і цэлага. Схема канструктыўнага злучэння галавы і плечавога пояса з улікам паварота натуршчыка ў адносінах да малюючага. Спосабы выяўлення партрэта чалавека у розных тэхніках графічнага мастацтва. Малюнак галавы натуршчыка з плечавым поясам. Вызначэнне прапарцыянальных суадносінаў паміж аб’’ёмам галавы, шыі і плечавога пояса. Анатамічная канструкцыя злучэння галавы, шэйных пазванкоў і плечавога пояса. Пошук пластычных асаблівасцей партрэта чалавека з плечавым поясам. Выкарыстанне законаў лінейнай і паветранай перспектывы і правілаў святлоценявога мадэлявання. Пошук найбольш характэрнага кампазіцыйнага рашэння. Танальныя суадносінаў галоўных аб’’ёмаў пастаноўкі і адлюстраванне на паперы з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяўленнем як тыповых, так і індывідуальных для натуршчыка рыс сродкамі графічнага мастацтва.

Прапануюцца наступныя практычныя заданні:

- малюнак партрэта натуршчыка з плечавым поясам;
- малюнак партрэта натуршчыка з плечавым поясам і рукамі.

Разам з аудыторнымі заданнямі студэнтам прапануецца самастойная работа:

- замалёвак натуршчыка з плечавым поясам, папера А -3.
- замалёўкі рук натуршчыка, фармат паперы А -3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ (*ЖЫВАПІС*)

### Тэма 1. Асновы тэхналогіі станковага жывапісу. Танальнасць і каларыт - асноўныя выразныя сродкі жывапісу

Віды станковага жывапісу паводле матэрыялаў і прызначэння. Жанравая разнастайнасць, тэматыка, сюжэты і матывы жывапісу. Эвалюцыя ў матэрыялах і тэхналогіі жывапісу. Спецыфіка тэхналогіі акварэльнага, гуашавага, тэмпернага, акрылавага і алейнага жывапісу. Абсталяванне працоўнага месца і інструменты жывапісу. Тэхніка бяспекі працы ў вучэбнай майстэрні.

Узаемасувязь спецдысцыплін і сістэмны падыход да вывучэння законаў акадэмічнага жывапісу. Танальныя адносіны - аснова кампазіцыі жывапіснага твора. Каларыт як асноўны выразны сродак жывапісу. Вучэбная і творчая задачы. Эцюд як асноўны від вучэбнай работы. Этапнасць работы над вучэбнымі натурнымі пастаноўкамі і пейзажнымі матывамі. Крытэрыі ацэнкі выканання праграмы заданняў.

Практычныя заняткі

Заданне 1.1

Нацюрморт плоскасны ў цёплым каларыце. Пастаноўка ў адной вертыкальнай плоскасці складаецца з плоскіх рэчаў вольнай формы або фігур простых геаметрычных формаў (лісце, тканіна, рознакаляровая папера, кардон) з уключэннем рэчы белага колеру.

*Задача.* На аснове прапанаванай натурнай пастаноўкі сфарміраваць на карціннай плоскасці кампазіцыю танальных мас з вызначэннем "кампазіцыйнага цэнтра" і "сілавой лініі кампазіцыі", адлюстраваць прапарцыянальную тоеснасць геаметрычных формаў, перадаць адпаведнасць колеравых адносін, імкнуцца да дасягнення каларыстычнай цэльнасці вы- явы. Праявіць валоданне элементарнымі прыёмамі класічнай тэхнікі пісьма.

Заданне 1.2

Нацюрморт прасторавы (размешчаны ў гарызантальнай і вертыкальнай плоскасцях) у халоднай гаме. Складаецца з дзвюх-трох рэчаў хатняга ўжытку (збанок, кварта, гародніна і да т.п.) на фоне драпіровак.

*Задача.* На аснове прапанаванай пастаноўкі пабудаваць арыгінальную танальна-колеравую кампазіцыю. Перадаць характар пластыкі простых аб'ёмных формаў і іх прапарцыянальную адпаведнасць. Праявіць уменне фарміраваць абагульненыя танапьныя масы і цэльны каларыт з перавагай ха- лоднай колеравай гамы адпаведна натурнай пастаноўкі. За- мацаваць раней набытыя навыкі пісьма ў класічнай жы- вапіснай манеры.

Заданне 1.3

"Белы" нацюрморт. Пастаноўка ў светлай, блізкай да белага колеру, нюанснай гаме з трох-чатырох рэчаў хатняга ўжытку (напрыклад, малочнік, чайнік-заварнік, чашка, ручнік) на фоне драпіровак.

*Задача.* Сфарміраваць кампазіцыю праз спалучэнне абагульненых танальных плям цёпла-халодных паўтаноў. Дасягнуць каларыстычнай цэльнасці работы на аснове спалучэння разнастайных па колеры, але блізкіх па тону светлых нюансаў. Праявіць уменне прытрымлівацца паслядоўнасці ў выкананні працы: ад агульнага да асобнага. Замацаваць навыкі пісьма ў класічнай жывапіснай манеры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 1.4

"Цёмны" нацюрморт. Пастаноўка складаецца з трох-чатырох рэчаў (напрыклад, чучала птушкі, яйкі, ганчарныя вырабы), уключаючы рэч кантрастнага светлага тону, і драпіровак з перавагай цёмнай танальнай гамы ў рассеяным асвятленні.

*Задача.* Сфарміраваць арыгінальную кампазіцыю з вызна- чэннем кампазіцыйнага цэнтра праз кантрастнае спалучэнне танальнасцей. Перадаць каларыстычнае багацце жывапіснай тканіны ў адлюстраванні цёмных аб'ектаў рэчаіснасці. На- быць навыкі валодання тэхнічнымі прыёмамі жывапіснага пісьма глыбокіх цёмных тонаў.

**Тэма 2. Спосабы і прыёмы акадэмічнага жывапісу ў адлюстраванні якасных характарыстык рэчаўнага свету**

Практычныя зняткі

Заданне 2.1

Нацюрморт з драўлянымі рэчамі сялянскага побыту. У склад нацюрморта могуць уваходзяць драўляныя рэчы хатняга ўжытку і традыцыйныя прылады працы беларусаў (кадушка, маслабойка, кош, абрэзак струганай дошкі, рубанак і да т.п.)

*Задача.* Перадаць аб'ёмна-прасторавыя характарыстыкі пастаноўкі, прапарцыянальнасць і канструкцыйнасць рэчаў; знайсці цэльную каларыстычную гаму і аптымальны тэхналагічны прыём у эмітацыі тэкстуры і фактуры дрэва.

Заданне 2.2

Нацюрморт з металічнымі рэчамі этнаграфічнага характару простай геаметрычнай формы (стары вугальны прас, самавар, чыгунок і да т.п.). Могуць уваходзіць сучасныя рэчы сталовага посуду (напрыклад, нікеліраваны кафейнік).

*Задача.* Пабудаваць кампазіцыю з улікам выяўлення вялікіх танальных плям і архітэктонікі а'б'ёмаў; дабіцца цэльнага, стрыманага каларыту, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

набліжаецца да манахрому; знайсці спецыфічныя выяўленчыя сродкі, каб перадаць фактуру рэчаў, ілюзію бліскучага і іржавага металу.

Заданне 2.3

Нацюрморт са шклянымі празрыстымі рэчамі (графін, буталь, шклянка і т.п.) і люстэркам у кантрастным асвятленні.

*Задача.* Сфарміраваць арыгінальную кампазіцыю танальных плям з улікам кантрастных светлоценявых адносін; перадаць "гульню" нюансаў светлых і цёмных тонаў; выкарыстаць спецыфічныя прыёмы жывапісу, якія адпавядаюць зфектам блікаў і празрыстасці.

Заданне 2.4

Нацюрморт з тканінай (драпіроўкі). Пастаноўка складаецца з некалькіх драгііровак розных фактур і колераў з мінімальнай прасторавай глыбінёй.

*Задача.* У кантэксце вырашэння кампазіцыйных, аб'ёмна-пластычных і каларыстычных задач знайсці аптымальныя выразная сродкі (стылістычныя прыёмы пісьма), якія адпавядаюць выяўленню рэльефнасці і фактуры тканін.

Заданне 2.5

Нацюрморт з ганчарнымі або керамічнымі вырабамі і раслінамі (сухацветы, калоссе жыта, саламяныя кветкі) у цёплай гаме.

*Задача.* Пабудаваць арыгінальную кампазіцыю, характар якой задаюць лінейныя рытм сухацветаў і пластыка сілуэтаў ганчарных вырабаў; перадаць танальныя і каларыстычныя адносіны пастаноўкі; выкарыстаць камбінацыю прыёмаў жы- вапіснага пісьма ў выяўленні матэрыяльнасці рэчаў.

Заданне 2.6

Нацюрморт з чучалам птушкі, чэрапам жывёлы або футрай у цёмнай гаме.

*Задача.* Стварыць кампазіцыйную структуру з галоўным і другасным цэнтрамі і дакладна азначанай сілавой лініяй кампазіцыі; перадаць цёмную танальнасць праз выразныя колеравыя адносіны; выкарыстаць спалучэнне розных тэхнічных прыёмаў у выяўленні асаблівасцей фактур рэчаў.

## Тэма 3. Асаблівасці жывапісна-пластычнага ўвасаблення рэчаўна-прасторавага асяроддзя інтэр'ера

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 3.1

Нацюрморт на фоне пейзажу. Пастаноўка з некалькіх рэчаў (напрыклад, кошык з садавіной, ручнік) можа быць устаноўлена на падаконніку або на верандзе на фоне лаканічнага пейзажу.

*Задача.* Сфарміраваць кампазіцыю выявы з улікам перадачы адзінага прасторавага асяроддзя і ўзаемасувязі інтэр'ера і пейзажу. Акцэнтаваць увагу на колеравых асаблівасцях у перадачы блізкіх і дальніх планаў. Дадатковае заданне - стварэнне эскіза творчай кампазіцыі па матэрыялу натурнага эцюда.

Заданне 3.2

Нацюрморт у інтэр'еры. Пастаноўка фарміруецца з фрагмента інгэр'ера вучэбнай майстэрні і некалькіх рэчаў вялікага памеру (напрыклад, мальберт, падрамнік, драпіроўкі або подыум з ганчарнымі вырабамі).

*Задача.* Дабіцца танальнай і жывапіснай цэльнасці ў перадачы прасторавага асяроддзя інтэр'ера і адлюстраванні сувязі рэчаў. Перадаць матэрыяльнасць рэчаў нацюрморта і эфект паветранага асяроддзя пастаноўкі. Дадатковая задача - стварэнне эскіза творчай працы па матыву натурнага эцюда.

Заданне 3.3

Маска гіпсавая ў інтэр'еры пры бакавым кантрастным асвятленні. Грызайль.

*Задача.* Перадаць ілюзію аб'ёмнай пластыкі пастаноўкі, "вылепіць форму" пры дапамозе святлоценявой градацыі тону. Знайсці аптымальны тэхнічны гірыём пісьма пластычнага рэльефа.

## Тэма 4. Метад работы танальна-колеравымі адносінамі ў адлюстраванні жывой натуры

Заданне 4.1

Нацюрморт у кантрастным бакавым святле ў абмежаванай прасторы. Нацюрморт складаецца з гіпсавага злепка галавы чалавека, некалькіх рэчаў і драпіровак. Пастаноўка размяшчаецца ля вакна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задача.* Перадаць танальныя і колеравыя адносіны пастаноўкі. Адлюстраваць аб'ёмную форму рэчаў і злепка галавы. Выявіць планавасць і прасторавасць размяшчэння адпаведна стану асветленасці. Выявіць розніцу фактур і тэкстур паверхняў рэчаў. Дадатковая задача - выкананне эскіза творчай кампазіцыі на аснове эцюда нацюрморта.

Заданне *4.2*

Эцюд галавы чалавека. Грызайль. Бакавое асвятленне.

*Задача.* Канструктыўная пабудова. Выяўленне характэрных прапорцый галавы. Лепка вялікай формы галавы. Танальныя адносіны. Прапрацоўка дэталей рэльефнай пластыкі галавы пры захаванні цэласнасці вялікай формы.

## ЛІТАРАТУРА па малюнку

*Асноўная*


*Авсиян О.А.* Натура и рисование / О.А.Авсисян. – М. : Изобразительное искусство, 1985. – 135 с.

*Агамирова А..* Советский станковый рисунок / Р. Глуховская. Первая Всесоюзная выставка: Альбом. – М. : Советский художник, 1981. – 174 с.

*Аксенов Ю.Г., Левидова М.М.* Цвет и линия: практическое руководство по рисунку и живописи / М.М. Левидова. Вып. 3. – М. : Советский художник, 1976. – С.21-29.

*Аксенов Ю.Г.* Рисунок / Ю.Г.Аксенов – М. : Панорама, 1990. – С. 17-28.

*Алехин А.Д.* Изобразительное искусство: Художник. Педагог. Школа: Книга для учителя / А.Д. Алехин – М. : Просвещение, 1984. – 168 с.

*Барщ А.О.* Наброски и зарисовки: Учеб. Метод. Пособие для худ. Училищ и училищ прикл. Искусства / А.О.Барщ . – М.: Искусство, 1970. – С. 32-45.

*Барщ А.О.* Рисунок в средней художественной школе / А.О.Барщ. – М. : Изд. Академии художеств СССР, 1963. – 198 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Беда Г.В.* Основы изобразительной грамоты / Г.В.Беда. – М. : Просвещение, 1981. – 211 с.

*Королев В.А.* Материалы и техника рисунка: Учеб. Пособие / В.А. Королев. – М. : Изобразительное искусство, 1987. – 78 с.

*Кулебакин Г.И.* Рисунок и основы композиции / Г.И. Кулебакин. – М. : Высшая школа, 1988. – 145 с.

*Нестеренко В.Е.* Линейный рисунок: Учеб. – метод. пособие / В.Е.Нестеренко – М., 1990. – 207 с.

*Радлов Н.Э.* Рисование с натуры / Н.Э.Радлов.. – М. : Советский художник, 1965. – “28 с.

*Ростовцев Н.Н.* Академический рисунок / Н.Н.Ростовцев. – М. : Просвещение, 1984. 231 с.

*Шаура Р.Ф.* Малюнак у навучальным працэсе. / Р.Ф.Шаура. – Мінск : Беларусь, 2003. – 119 с.

*Шаура Р.Ф.* Перспектыва ў малюнку і жывапісе / Р.Ф.Шаура. – Мінск : Беларусь, 1999. – 112 с.

*Дадатковая*

*Лаптев А.* Рисунок пером / А.Лаптев. – М. : Изд. Академии художеств СССР, 1980. – 194 с.

Рисунок. Композиция. Хрестоматия / Сост. Н.Н.Ростовцев и др. – М.: Искусство, 1963. – 324 с.

*Товстик В.А.* Рисунок – основа изобразительного искусства / Вопросы преподавания специальных художественных дисциплин: учеб. – метод. пособие / В.А.Товстик.. – Мінск : Мин. Культуры БССР, 1989. – 96 с.

*Шешко И.Б.* Построение и перспектива рисунка: Учеб. Пособие / И.Б.Шешко. – Мінск.: Вышэйшая школа, 1977.

*Шорохов Е.В..* Композиция: Учеб. Пособие /Е.В.Шорохов., Н.Г.Козлов. – М. : Просвещение, 1978. 235 с.

**ЛІТАРАТУРА па жывапісу**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўная

*Беда Г.В.* Живопись н ее выразительные средства. — М., 1977.-С. 5-22.

*Волков Н.Н.* Композицня в живописи. - М., 1977. - С. 40-68.

*Горогценко Г.Т.* Акварель: учеб. пособне. - М., 1966. - С. 12-50.

*Кальнинг А.К.* Акварельная живопись: краткое руководство. - М., 1968. - С. 42-60.

*Мыхайлов А.М.* Искусство акварели. - М., 1995. - С. 62-150.

*Ревякин П.П.* Техника акварельной жнвописи. - М., 1976. -С. 44-71.

*Рынкевіч У.І.* Акварэльны жывапіс. - Мн. 1998. -С. 5-51.

*Рынкевіч У.І.* Мастацтва акварэлі. - Мн., 2001. - С. 9-110.

*Смирнов Г.Б. Унковский А.А.* Рисунок н жнвопись пейзажа. -М., 1985.-С. 3-15.

*Столяров П.М.* Акварель: материалы н способы письма. - Мн,, 1980,- С. 32-50.

*Стор М.Н.* Этюд натюрморта. Акварель: конспект лекций. -М., 1982.-С. 5-45.

*Яшухин А.П.* Живопись. - М., 1985. - С. 6-56; 62-150.

Дадатковая

*Беларуская* акварэль: альбом / аўт. - склад. А.А.Бяспалы. - Мн., 1978.-С. 5-8.

*Беспалый А.А.* Белорусская акварель. - Мн., 1989. -С. 3-80.

*Латышская* советская акварельная живопись: альбом / сост. и автор текста Р.К.Бем. - Рнга, 1974. - С. 5-16.

*Мыхайлов А.М., Гаджило Т.А.* Акварель: советы начннаюшим.-М., 1991.-С. 10-63.

*Павло В.* Сучасна украі'нська акварель. - Киев, 1978. - С. 8-15.

*Современная* латышская акварель: альбом / сост. и автор текста Р.К.Бем. - Рига, 1984. - С. 5-15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Современная* советская акварель: альбом / сост. и авторы текста Володин В.Н., Володина Н.А. - М., 1983. - С. 5-25.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ